**Беларускі дом правоў чалавека ім. Барыса Звозскава**

**Умовы конкурсу на падтрымку праектаў,**
**накіраваных на абарону і прасоўванне правоў чалавека і дэмакратычных каштоўнасцяў**

**Змест**


1. Агульныя палажэнні і мэта конкурсу........................................1
2. Змест конкурсу па катэгорыях праектаў........................................1
3. Умовы ўдзелу ў конкурсе, крытэрыі адбору........................................2
4. Умовы і парадак фінансавання........................................4
5. Парадак, тэрміны і графік правядзення конкурсу........................................4


## 1. Агульныя палажэнні і мэта конкурсу

1.1. Дадзены конкурс праводзіцца Беларускім домам правоў чалавека ім. Барыса Звозскава (БДПЧ) пры фінансавай падтрымцы Еўрапейскага Саюза з мэтай падтрымкі дзейнасці, накіраванай на заахвочванне і ўмацаванне актыўных і арыентаваных на змены падыходаў да правоў чалавека і дэмакратычных працэсаў сярод праваабарончых і дэмакратычных суб'ектаў у Беларусі (каб яны маглі узяць на сябе вядучую ролю ў галіне правоў чалавека і дэмакратыі).

1.2. У рамках конкурса будуць падтрыманыя праекты па трох катэгорыях:

1.2.1. Катэгорыя 1: Малыя гранты на праекты па абароне і прасоўванні правоў чалавека і развіцці дэмакратыі;

1.2.2. Катэгорыя 2: Гранты на буйнейшыя і/або супольныя праекты па абароне і прасоўванні правоў чалавека і развіцці дэмакратыі;

1.2.3. Катэгорыя 3: Гранты на даследаванні ў грамадскай сферы.

## 2. Змест конкурсу па катэгорыях праектаў

**2.1. Катэгорыя 1**: **Малыя гранты** на праекты па абароне і прасоўванні правоў чалавека і развіцці дэмакратыі

**2.1.1.** У рамках Катэгорыі будуць падтрыманыя ініцыятывы і праекты, накіраваныя на прасоўванне дэмакратыі, правоў чалавека і вяршэнства права і развіцця і ўмацавання грамадзянскай супольнасці Беларусі. Прыклады тэм уключаюць:

2.1.1.1. мабілізацыю і пашырэнне правоў і магчымасцяў уразлівых групаў;

2.1.1.2. спрыянне дэмакратычным працэсам;

2.1.1.3. маніторынг і кантроль канкрэтных парушэнняў правоў чалавека;

2.1.1.4. развіццё мясцовых супольнасцяў і вырашэнне іх праблем;

2.1.1.5. прасоўванне падыходу, заснаванага на правах чалавека як у дэмакратычных арганізацыях, так і ў асяродках, з якімі яны працуюць.

**2.2. Катэгорыя 2: Гранты** на буйнейшыя і/або супольныя праекты па абароне і прасоўванні правоў чалавека і развіцці дэмакратыі

**2.2.1.** У рамках Катэгорыі 2 будуць падтрыманыя праекты, накіраваныя на прасоўванне дэмакратыі, правоў чалавека і вяршэнства права і развіцця і ўмацавання грамадзянскай супольнасці Беларусі. Прыклады тэм уключаюць:

2.2.1.1. нарошчванне патэнцыялу ў інтарэсах умацавання органаў самакіравання грамадзянскай супольнасці ў галіне правоў чалавека (г.зн. платформаў, сетак і кааліцый);

2.2.1.2. арганізацыю дыскусійных форумаў для паляпшэння дыялогу і ўзаемадзеяння паміж арганізацыямі грамадзянскай супольнасці, сродкаў масавай інфармацыі і асобаў, якія прымаюць рашэнні;

2.2.1.3. падтрымку ўзмоцненага палітычнага дыялогу (г.зн. выпрацоўку палітычных або заканадаўчых рэкамендацый);

2.2.1.4. іншую супольную дзейнасць у галіне правоў чалавека, альбо дзейнасць, якая ўключае праваабарончы або адвакацыйны кампанент і адпавядае галоўнай мэце конкурсу.

### 2.3. Катэгорыя 3: Гранты на даследаванні

**2.3.1.** У рамках Катэгорыі 3 будуць падтрыманыя праекты, накіраваныя на правядзенне даследаванняў і аналітычнай ацэнкі/параўнальнага аналізу сітуацыі, для таго, каб арганізацыі стварылі/абнавілі сваю ўласную тэорыю зменаў да новых рэалій Беларусі, у тым ліку даследаванні, маніторынг, дакументаванне і справаздачнасць аб правах чалавека і г.д.;

**2.3.2.** Прыярытэтныя напрамкі даследаванняў (спіс невычарпальны): роля ПЧ як фактара матывацыі персанала ў розных сферах занятасці і галінах эканомікі; роўнасць і недыскрымінацыя; успрыманне правоў чалавека рознымі мэтавымі групамі; даследаванне досведа ўзаемадзеяння арганізацый грамадзянскай супольнасці з дзяржаўным і камерцыйным сектарам, а таксама міжсектаральнае ўзаемадзеянне ў межах самой грамадзянскай супольнасці; даследаванне смяротнага пакарання ў Беларусі (стаўленне да наяўнасці такой формы пакарання, асноўныя аргументы прыхільнікаў і праціўнікаў пакарання і г.д.); наяўнасць ў беларускім грамадстве самаабароны ад сучасных метадаў прапаганды; праблемы рэалізацыі свабоды слова ў інтэрнеце і шляхі іх вырашэння; удзел у грамадзянскай супольнасці (умовы да такой актыўнасці, гатоўнасць ахвяраваць часам, ведамі, грашыма, імідж грамадскай дзейнасці і грамадскага акывіста, НДА у сацыяльных сетках і г.д.); механізмы і магчымасці пашырэнення грамадзянскіх супольнасцяў.

## 3. Умовы ўдзелу ў конкурсе, крытэрыі адбору

### 3.1. Агульныя ўмовы і крытэрыі адбору

**3.1.1.** Праекты павінны быць скіраваныя на супольную дзейнасць у абарону грамадскіх інтарэсаў і правоў чалавека;

**3.1.2.** Заяўкі падаюцца наступным чынам:

3.1.2.1. У рамках кожнай катэгорыі арганізацыя можа падаць толькі адну заяўку ў якасці асноўнага заяўніка, пры гэтым абмежаванняў па колькасці праектаў, у якіх арганізацыя можа быць партнёрам, няма;

3.1.2.2. Арганізацыя ў якасці асноўнага заяўніка можа адначасова падаць па адной заяўцы на Катэгорыю 1 і на Катэгорыю 3 альбо на Катэгорыю 2 і на Катэгорыю 3;

3.1.2.3. Арганізацыя ў якасці асноўнага заяўніка не можа адначасова падаць заяўкі на Катэгорыю 1 і на Катэгорыю 2;

**3.1.3.** Прыярытэтнымі з'яўляюцца праекты:

3.1.3.1. Пададзеныя рэгіянальнымі або мясцовымі арганізацыямі ці ініцыятывамі;

3.1.3.2. Накіраваныя на абарону правоў уразлівых і маргінальных групаў;

3.1.3.3. Якія маюць на мэце атрымаць доўгатэрміновыя пазітыўныя вынікі ці ўносяць станоўчыя змены ў агульную сітуацыю з правамі чалавека ў краіне;

3.1.3.4. У якіх ужываецца падыход, заснаваны на правах чалавека.

**3.1.4.** Прапанаваная праектная дзейнасць павінна адпавядаць мэтам дадзенага конкурсу;

**3.1.5.** Фінансаванне можа прадастаўляцца як для новага, асобнага праекта, так і для часткі праекта, які ўжо ажыццяўляецца;

**3.1.6.** Бюджэт можа ахопліваць пэўны працэнт ад бягучых выдаткаў заяўнікаў, калі такія выдаткі непасрэдна звязаныя з дзейнасцю па праекце;

**3.1.7.** Абавязковай умовай для праектаў катэгорыяў 2 і 3 з'яўляецца наяўнасць сафінансавання з іншых крыніцаў у памеры не менш за 5% ад бюджэту праекта[1];

**3.1.8.** Будуць разгледжаныя толькі тыя заяўкі, якія адпавядаюць прыкладзенай форме і іншым умовам конкурсу, прадстаўленыя не пазней за ўстаноўлены дадзеным Палажэннем тэрмін.

**3.1.9.** Пры разглядзе заявак будуць улічвацца:

- 3.1.9.1. актуальнасць прапанаванага праекта для бягучай сітуацыі з правамі чалавека;
- 3.1.9.2. адпавяданне праекта агульнай мэце конкурса;
- 3.1.9.3. наяўнасць рэалістычнай і дасягальнай мэты праекта;
- 3.1.9.4. адпавяданне дзейнасці заяўленым мэтам;
- 3.1.9.5. устойлівасць дзейнасці пасля заканчэння фінансавання;
- 3.1.9.6. рэалістычнасць, абгрунтаванасць бюджэту;
- 3.1.9.7. наяўнасць сафінансавання ў памеры не менш за 5% ад бюджэту (для праектаў катэгорыяў 2 і 3).

### 3.2. Адмысловыя ўмовы па Катэгорыі 1

**3.2.1.** Хто можа падаваць заяўку:

- 3.2.1.1. Праваабарончыя арганізацыі або арганізацыі/ініцыятывы грамадзянскай супольнасці або групы праваабаронцаў (асабліва новых арганізацый і арганізацый, якія працуюць у рэгіёнах);
- 3.2.1.2. палітычныя групы ў падтрымку дэмакратыі, якія дзейнічаюць сумесна альбо з іншымі палітычнымі групамі, альбо з арганізацыямі грамадзянскай супольнасці;
- 3.2.1.3. у крайніх выпадках можа быць разгледжаная заяўка ад адной партыі/палітычнага руху, але такая дзейнасць мусіць быць таксама накіраваная на супрацоўніцтва з іншымі суб’ектамі грамадзянскай супольнасці.

**3.2.2.** Праекты па дадзенай катэгорыі мусяць скончыцца **да 1 жніўня 2019 г**.

### 3.3. Адмысловыя ўмовы па Катэгорыі 2

**3.3.1.** Заяўкі па дадзенай катэгорыі прымаюцца ад буйных НДА і ініцыятыў, якія маюць досвед у рэалізацыі розных праектаў у Беларусі і рэгіёнах;

**3.3.2.** Прэтэндэнты па гэтай катэгорыі мусяць выкарыстоўваць або прытрымлівацца падыходу, заснаванага на правах чалавека, ў сваёй дзейнасці;

**3.3.3.** Заяўкі падаюцца прынамсі дзвюма праваабарончымі арганізацыямі або арганізацыямі/ініцыятывамі грамадзянскай супольнасці;

**3.3.4.** Праект пажадана мусіць быць разлічаны на перыяд, большы за год; калі працягласць праекта — адзін год, то сума субгранта не можа перавышаць 50 000 EUR;

**3.3.5.** Падтрымка можа ўключаць у сябе некаторую базавую падтрымку садзейнічанню ўстойлівасці НДА, якія працуюць па важных пытаннях правоў чалавека і дэмакратыі і часта сутыкаюцца з праблемамі недахопу актывістаў і празмернай загрузкі працай;

**3.3.6.** Праекты па дадзенай катэгорыі мусяць скончыцца **да 1 кастрычніка 2020 г.**

### 3.4. Адмысловыя ўмовы па Катэгорыі 3

**3.4.1.** Заяўкі па дадзенай катэгорыі прымаюцца ад асобных даследчыкаў або аналітычных цэнтраў з досведам у правядзенні даследаванняў у галіне правоў чалавека, або сумесна аналітычным цэнтрам і НДА для даследавання, якое прынясе карысць гэтаму НДА і яго мэтавай групе;

**3.4.2.** Прыярытэт будзе надавацца супольным заяўкам ад НДА і аналітыкаў;

**3.4.3.** Праекты па дадзенай катэгорыі мусяць скончыцца **да 1 жніўня 2019 г**.

---

[1] Крыніцай дафінансавання не можа быць Еўракамісія.

## 4. Умовы і парадак фінансавання

4.1. Сродкі, якія прадастаўляюцца на рэалізацыю праектаў, павінны выкарыстоўвацца выключна на мэты абвешчанага конкурсу і могуць уключаць аплату экспертных ганарараў, пераклад дакументаў, аплату праездаў, харчавання, пражывання, арэнды памяшканняў, канцэлярскіх выдаткаў, калі яны наўпрост звязаныя з дзейнасцю па дасягненню задач, вызначаных гэтым конкурсам.

4.2. Сродкі, якія прадастаўляюцца на рэалізацыю праектаў, не могуць выкарыстоўвацца:
- 4.2.1. на закупку рухомай або нерухомай маёмасці;
- 4.2.2. на ажыццяўленне дзейнасці, не звязанай з прадстаўленым на конкурс праектам;
- 4.2.3. на вядзенне камерцыйнай дзейнасці;
- 4.2.4. на аказанне гуманітарнай і/або сацыяльнай дапамогі асобным асобам;
- 4.2.5. на аплату лячэння, адукацыі, адпачынку;
- 4.2.6. на аплату непрадбачаных выдаткаў.

4.3. Аб'ём выдаткаў на зарплаты наёмных супрацоўнікаў не павінен перавышаць 30% бюджэту праекта.

4.4. **Сумы фінансавання праэктаў**:
- 4.4.1. Катэгорыя 1: ад 3 000 да 10 000 эўра;
- 4.4.2. Катэгорыя 2: ад 10 001 да 80 000 эўра для праектаў тэрмінам, большым за год; да 50 000 еўра для праектаў працягласцю ў адзін год;
- 4.4.3. Катэгорыя 3: ад 3 000 да 10 000 эўра.

4.5. Бюджэт павінен прадугледжваць дзве аднадзённыя паездкі ў Вільнюс на аднаго чалавека для заключэння дамовы і справаздачнасці па праекце.

4.6. Першы транш па зацверджаным праекце у пачатку рэалізацыі складзе 80%, другі транш пасля заканчэння праекта і зацвярджэння справаздачнасці - 20%.

4.7. Маніторынг рэалізацыі праектаў забяспечвае арганізатар конкурсу.

4.8. Усе выдаткі павінны быць абгрунтаваныя, задакументаваныя і пацверджаныя ў адпаведнасці з правіламі і працэдурамі ЕС.

## 5. Парадак, тэрміны і графік правядзення конкурсу

**5.1.** Заяўкі на конкурс прымаюцца да **23:59 1 чэрвеня 2018 г.** на адрас: grants.belarus@humanrightshouse.org. ***У тэме ліста абавязкова пазначыць "Заяўка на конкурс Катэгорыя Х", дзе "Х" – нумар катэгорыі, па якой падаецца заяўка***.

**5.2.** **Падвядзенне вынікаў конкурсу: да 1 ліпеня 2018 г**. Усе ўдзельнікі конкурсу атрымаюць апавяшчэнне аб рашэнні конкурснай камісіі. Удзельнікі конкурсу, чые заяўкі будуць адабраныя конкурснай камісіяй, атрымаюць запрашэнне для падпісання пагаднення аб рэалізацыі праекта пасля дадатковага ўзгаднення ўмоваў і бюджэту праекта.

**5.3.** **Падпісанне грантавых пагадненняў: да 1 жніўня 2018 г**.

**5.4.** **Заканчэнне рэалізацыі праектаў: па Катэгорыі 1: да 1 жніўня 2019 г., па Катэгорыі 2 – да 1 кастрычніка 2020 г., па Катэгорыі 3 – да 1 жніўня 2019 г.**

**5.5.** Усе пытанні, звязаныя з падачай заявак, правядзеннем конкурсу, ажыццяўленнем праектаў, можна накіроўваць на адрас grants.belarus@humanrightshouse.org. У выпадку неабходнасці магчыма камунікацыя праз бяспечныя каналы. Ключ PGP дадаецца да гэтага палажэння асобным файлам.